# ПРАДМОВА

У даследаванні традыцыйнага народнага мастацтва на працягу апошніх дзесяцігоддзяў асноўны акцэнт быў скіраваны на яго віды і формы утылітарна-функцыянальнага характару. Зразумела, што традыцыйныя віды народнага мастацтва атаясамляюцца перш за ўсё з сялянскім укладам жыцця, з яго матэрыяльнай і эстэтычнай культурай. У эпоху вядзення натуральнай гаспадаркі народнае мастацтва развівалася ва ўмовах жыццядзейнасці чалавека, звязанага з апрацоўкай зямлі, будаўніцтвам жылля, наогул вырабам таго, што стварала цэласную інфраструктуру сялянскага ладу. Эстэтычныя ўяўленні і светапогляд людзей на дадзеным этапе грамадскага развіцця адпавядалі яго эканамічнаму, ідэалагічнаму і маральнаму зместу, этнічнай ментальнасці, звычаям, вераванням і традыцыям народа.

Век навукова-тэхнічнага прагрэсу выклікаў змены ва ўсіх сферах жыцця чалавека. Ён разбурыў не толькі шматвяковы жыццёвы ўклад вёскі, тэхнакратызаваў гарадское асяроддзе, але і змяніў этнакультурную ідэалогію народаў, успрыманне і асэнсаванне каштоўнасных катэгорый чалавечага быцця. Вытворчая і сацыяльная сферы грамадства на сучасным этапе карэнным чынам паўплывалі на каштоўнасныя арыентацыі чалавека ў духоўнай сферы. Сёння знікла неабходнасць у самаробных тканых рэчах, ганчарных вырабах, шматлікіх прадметах хатняга ўжытку, меўшых у сваёй аснове утылітарныя і эстэтычныя функцыі. Палітыка урбанізацыі і “сцірання розніцы паміж вёскай і горадам”, якая была актуальнай у 60—70-я гг. XX ст., адмоўна адбілася на традыцыйнай мастацкай культуры, на яе аўтэнтычных відах і формах. Многія з іх зніклі наогул, і толькі, дзякуючы намаганням мастацтвазнаўцаў, кіраўнікоў творчых калектываў Дамоў рамёстваў, выкладчыкаў спецыялізаваных навучальных устаноў у галіне народнага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

мастацтва, сёння адраджаюцца, хаця і на новай аснове разумення іх эстэтычных якасцей.

Народная творчасць як сацыякультурная з'ява на сучасным этапе мае шырока разгалінаваную сетку установ арганізацыйна-метадычнага, вучэбна-выхаваўчага, навуковага і адукацыйнага характару. Гэтыя структуры галоўным чынам накіраваны на рэалізацыю важнай у дзяржаўным плане праграмы маральнага, эстэтычнага выхавання чалавека ва ўмовах дэмакратызацыі і гуманізацыі грамадства. На сучасным этапе, як ніколі раней, стаіць задача маральнага выхавання чалавека, фарміравання яго высокіх грамадзянскіх якасцей, гуманістычнай свядомасці, культуры. Гэта задача вырашаецца шматлікім комплексам сацыяльных інстытутаў, сярод якіх вялікае значэнне належыць сістэме адукацыі, выхаваўча-асветным установам, установам культуры, творчым арганізацыям. Народная мастацкая творчасць як феномен культуры пранізвае ўсе сферы духоўнага жыцця людзей. Маючы непасрэдныя адносіны да адукацыйнага і выхаваўчага працэсу, яна выконвае сацыяльна значную функцыю фарміравання гарманічна развітой асобы, чалавека-творцы, носьбіта высокіх агульначалавечых духоўных каштоўнасцей.

Новыя сацыяльна-палітычныя і эканамічныя ўмовы ў апошняе дзесяцігоддзе ў значнай ступені паўплывалі і на сістэму народнай творчасці з яе трывалым пералікам структурных падраздзяленняў рэспубліканскага і абласнога маштабу. Цэлы комплекс арганізацыйна-метадычных структур быў ліквідаваны, зменшыліся матэрыяльныя магчымасці адпаведных устаноў культуры па забеспячэнні дзейнасці ўсіх формаў народнай творчасці ў рэспубліцы. Аднак створаны часовы вакуум у гэтай галіне культуры быў запоўнены новымі грамадскімі арганізацыямі і ўстановамі, якія ўзнялі на новую ступень працэс развіцця народнай творчасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Паспяхова функцыянуе Беларускі інстытут праблем культуры, які вырашае пытанні навукова-метадычнага характару, выпрацоўвае стратэгічную лінію перспектыўнага развіцця народнай культуры, яе захавання, засваення і трансляцыі на сучасным этапе. Значную работу па адраджэнні і развіцці традыцыйных відаў народнага мастацтва вядзе Беларускі саюз майстроў народнай творчасці, які падтрымлівае пастаянную сувязь са старэйшымі народнымі майстрамі-носьбітамі аўтэнтычных формаў народнай культуры, садзейнічае ўключэнню моладзі ў актыўны творчы працэс.

Адметнай рысай у развіцці традыцыйнага народнага і самадзейнага мастацтва стала падрыхтоўка спецыялізаваных кадраў з сярэднеспецыяльнай і вышэйшай адукацыяй. Вучылішчы мастацтваў, Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры, а таксама ВНУ педагагічнага кірунку мэтанакіравана забяспечваюць усю сістэму народнай творчасці прафесійнымі кадрамі спецыялістаў, якія ажыццяўляюць мастацка-творчую, арганізацыйна-метадычную і вучэбна-выхаваўчую дзейнасць. Такая работа з'яўляецца своеасаблівай гарантыяй таго, што працэсам развіцця народнай мастацкай культуры будуць займацца падрыхтаваныя, адукаваныя спецыялісты, якія змогуць забяспечыць вырашэнне задач гэтай сферы на правільнай, навукова абгрунтаванай аснове.

Народная творчасць Беларусі на сваім гістарычным шляху зведала значную эвалюцыю, трансфармуючыся ў тыя мастацкія каштоўнасці, якія патрабавалі час, эпоха і сацыяльны стан грамадства. Страціўшы на сучасным этапе практычныя, функцыянальныя задачы, многія адроджаныя віды народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва сталі прадметам чыста эстэтычнага прызначэння. Багацце народнага густу, фантазіі, уменне рабіць рэчы прыгожымі, прывабнымі захоўваліся і захоўваюцца ў рукатворным народным мастацтве заўсёды. Гэта зыходзіць ад унутранай патрэбы чалавека, майстра, мастака ствараць



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

прыгожае, рабіць прадметы не толькі зручнымі, але і эстэтычна гарманічнымі, бо яны ўпрыгожваюць наша жыццё. У гэтым дапамагае нам веданне гісторыі і культуры народа, традыцый вуснага, песеннага, музычнага і выяўленчага фальклору, што з‘яўляецца багаццем нашай краіны. Будучае ў развіцці народнай творчасці можа быць гарантавана толькі праз засваенне назапашанага культурна-гістарычнага багажу ў мінулым.

Менавіта тыя пытанні, што так абвострана стаяць перад агульнай праблемай захавання, развіцця і трансляцыі народнай мастацкай культуры на сучасным этапе, былі разгледжаны на рэспубліканскай навуковай канферэнцыі, матэрыялы якой мы і прапануем чытачу.

*Рыгор Шаура, прафесар,*
*загадчык кафедры*
*народных рамёстваў БДУ культуры*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ